№6 (306) 2018 г.

ГРОДНЕНСКИЕ ЕПАРХИАЛЬНЫЕ
ВЕДОМОСТИ

ЕЖЕМЕСЯЧНАЯ ГАЗЕТА ГРОДНЕНСКОЙ ЕПАРХИИ   ОСНОВАНА В 1901 Г. ВОЗОБНОВЛЕНА В 1992 Г.

Архиепископ Артемий совершил Литургию в малом храме прихода святых равноапостольных Мефодия и Кирилла города Волковыска



24 мая – престольный праздник на приходе святых равноапостольных Мефодия и Кирилла, учителей Словенских города Волковыска. Поздравить прихожан и совершить Божественную литургию в этот день на приход прибыл архиепископ Гродненский и Волковысский Артемий. Торжественное богослужение было совершено в малом храме прихода, освященном 5 лет назад в честь Введения во храм Пресвятой Богородицы. За Литургией Владыка вручил церковные награды наиболее активным прихожанам.

В день празднования иконы "Неупиваемая Чаша" братчики ПОТ "Покровское" дали обет трезвости



18 мая 2018 года, в пятницу 6-й седмицы по Пасхе, в день празднования иконы Божией Матери «Неупиваемая Чаша» и мученицы Ирины, в Свято-Покровском кафедральном соборе города Гродно духовник и шестеро братьев православного общества трезвости "Покровское" при молитвенной поддержке духовенства, родных, близких и прихожан храма принесли Господу обеты трезвости сроком от 4-х месяцев до 3-х лет.

Молебное пение о страждущих недугом винопития и наркомании в сослужении координатора Гродненской епархии по работе с алкоголе- и наркозависимыми людьми иерея Павла Касперовича и протодиакона Дмитрия Шепелева совершил духовник приходского общества трезвости "Покровское", клирик собора иерей Михаил Перец. Православное общество трезвости «Покровское» при Свято-Покровском кафедральном соборе г. Гродно начало свою работу 12 ноября 2011. Общество создавалось по инициативе людей, страдающих от алкоголизма. Реабилитационная деятельность общества основывается на православном мировоззрении и духовном святоотеческом опыте борьбы со страстями. Члены общества принимают обеты трезвости и активно участвуют в богослужебно-литургической жизни общины Свято-Покровского собора. С 2011 по 2017 год реабилитационную программу прошли более 80-ти человек, страдающих от зависимостей и их родственники.

Архиерей

Пра сотніка



У сённяшні нядзельны дзень, браты і сёстры, Святая Царква прапанавала нашай увазе евангельскі сюжэт, які апавядае нам пра непахісную, я б нават сказаў - каменную веру чалавека-язычніка – сотніка рымскага войска, у якога быў хворы слуга. Гэты чалавек, на радзіме якога больш за тысячу гадоў квітнела язычніцтва, пачуў пра Хрыста Месію, паверыў у Яго і тады, калі невылечна захварэў яго слуга, ён пайшоў да Хрыста, каб звярнуцца да Яго з просьбай аб ацаленні хворага. Гэтыя словы сотніка ўзгадвае нам сёння апостал і евангеліст Матфей: "Госпадзі! Слуга мой ляжыць дома спаралізаваны і моцна пакутуе." (Мф.8:6) Ісус адказвае яму, што гатовы прыйсці ў яго дом і ацаліць хворага, але тут сотнік прамаўляе дзіўныя словы: "Госпадзі! Я не варты, каб Ты ўвайшоў пад мой дах; але скажы толькі слова, і выздаравее слуга мой. Бо і я чалавек падуладны; але, маючы ў сябе падначаленых мне воінаў, кажу аднаму: "ідзі", і ідзе; і другому: "прыйдзі", і прыходзіць; і рабу майму: "зрабі гэта", і робіць." (Мф.8:8-9). Калі Гасподзь пачуў гэтыя словы, Ён, звяртаючыся не толькі да сотніка, але і да ўсіх, хто быў побач з Ім, сказаў: "Праўду кажу вам: і ў Ізраілі не знайшоў Я такой веры" (Мф.8:10).

Так, сапраўды, браты і сёстры, можна толькі здзіўляцца і ўражвацца той веліччу і цвёрдасцю веры, якая была ў гэтага чалавека перад Хрыстом Збавіцелем. Мы часта разважаем пра веру і гаворым пра яе, спасылаючыся на словы апостала Паўла, што "без веры дагадзіць Богу немагчыма" (Яўр.11:6). Але пры гэтым мала хто з нас, на жаль, задумваецца над тым, што вера – гэта толькі пачатковы этап, толькі першыя крокі чалавека ў накірунку да Бога.

Затым жа ў жыцці кожнага чалавека вера павінна, калі хочаце, ператварыцца ў давер да Бога, а праз давер мы павінны набыць у нашым сэрцы і нашай душы вернасць Богу. І калі, хутчэй за ўсё, вера яшчэ жыве ў нашым сэрцы, то што да даверу да Бога і вернасці Яму – іх у нашым жыцці няма. Мы павінны помніць, што для Бога няма перашкодаў, была б толькі наша вера і наш давер да Яго! Вера і давер у кожным з нас павінны нарадзіць вернасць Богу, якая ні пры якіх абставінах не дасць нам усумніцца ў тым, што Гасподзь побач, што Ён заўсёды можа прыйсці нам на дапамогу, толькі б мы заўсёды звярталіся да Яго. Звярніце ўвагу на сённяшні евангельскі сюжэт. Сотнік кажа: "Госпадзі, скажы адно толькі слова! Аднаго Твайго слова дастаткова, каб слуга мой ачуняў".

Вось як бывае! Сотнік толькі папрасіў – і адразу яго слуга стаў здаровым, хоць ён цяжка хварэў, ляжаў спаралізаваны і не мог узняцца з ложка. А мы часта падоўгу молімся за хворых, і нічога не атрымліваецца. Гасподзь нам дае прыклад сотніка: калі малітва наша будзе падобна да ягонай, та яна гэтаксама будзе пачута і выканана. Таму трэба вельмі ўважліва ў гэта Евангелле ўчытацца, услухацца, угледзецца, каб мы змаглі сваю малітву зрабіць такою ж выніковай, як у сотніка. Чым жа гэты сотнік нам цікавы? Ды шмат чым. Па-першае, ён прасіў не за сябе, не за ўласнага сына ці дачку, нават не за воіна, які яму падпарадкоўваецца, а за слугу свайго. Гэта гаворыць пра яго вялікую любоў, таму што рэдка які начальнік так любіць свайго падначаленага, што будзе пра яго клапаціцца, кудысьці пойдзе і стане за яго прасіць. Вось першая дабрадзейнасць: у яго вельмі міласцівае сэрца, здольнае на любоў да чалавека, які значна ніжэйшы за яго па сваім становішчы.

Далей, мы ведаем, што сотнік сказаў: " Госпадзі! Я не варты, каб Ты ўвайшоў пад мой дах; але скажы толькі слова, і выздаравее слуга мой" (Мф.8:8). Гэты чалавек валодаў вялікім змірэннем. Ён мог проста паслаць некалькі воінаў і загадаць ім: вось гэтага прывядзіце да мяне. Сотнік быў акупантам, камандзірам гарнізона – гэта значыць, у маштабе Капернаума ён быў буйным начальнікам. Але замест таго, каб накіраваць сваіх падначаленых да Ісуса, ён сам ідзе да Яго і просіць у Яго. Мала таго, што просіць. Калі Гасподзь сказаў: "Я зараз прыйду і ацалю твайго слугу" (Ён зрабіў гэта таму, што бачыў: гэты чалавек міласэрны і сапраўды спачувае хвораму), сотнік адказаў: "Я няварты таго, каб Ты да мяне прыйшоў".

Гэта значыць, сотнік меў вялікае змірэнне, маючы пры гэтым такую вялікую ўладу. А ўлада страшэнна псуе людзей. Мала хто з людзей можа вытрымаць выпрабаванне ўладай, таму што ўсе астатнія пачынаюць перад ім гнуць спіну, дагаджаць, ліслівіць, падхалімнічаць. І чалавек, калі яму не хапае розуму (а часцей за ўсё яго звычайна і не хапае), пачынае гэтыя знакі ўвагі прымаць на ўласны рахунак, хаця людзі схіляюцца перад уладай, а не перад ім. Таму што як толькі ён памрэ, яго адразу ж забудуць і ніколі больш не ўспомняць, а будуць толькі смяяцца. Гэта значыць, кланяюцца перад яго пасадай, а чалавек па сваёй неразумнасці, па сваёй грахоўнасці залічвае гэта асабіста сабе.

Але сотнік гэтай спакусе не паддаўся. Ён з вялікім змірэннем падышоў… зрэшты да каго ён падышоў? Да нейкага вандроўчага прапаведніка, якога любы мог пакрыўдзіць, які нават і свайго ўласнага сталага жытла не меў, не меў, дзе галавы сваёй прыхіліць, быў проста жабраком. І вось гэтаму жабраку ён гаворыць: "Я няварты, каб Ты ўвайшоў у дом мой". І далей: " Бо і я чалавек падуладны; але, маючы ў сябе падначаленых мне воінаў, кажу аднаму: "ідзі", і ідзе; і другому: "прыйдзі", і прыходзіць; і рабу майму: "зрабі гэта", і робіць". Гэтым сотнік паказаў, што падначаленыя слухаюцца яго без пярэчання, але тут улада Божая, і ён саступае перад ёй са сваёю зямною ўладаю, прызнаючы, што яна нішто ў параўнанні з той уладай, якую мае Сын Божы. Так, будучы чалавекам, які мае вялікія магчымасці і паўнамоцтвы, ён, тым не менш, з глыбокай пакорай падышоў да Збавіцеля. Якое супрацьлеглае стаўленне да Царквы мы бачым часамі сёння з боку тых, хто сёння мае ўладу.

«Пачуўшы гэта, Ісус здзівіўся і сказаў тым, што ішлі за Ім: праўду кажу вам: і ў Ізраілі не знайшоў Я такой веры» (Мф.8:10). А ў чым была гэта вера? Ён сказаў: скажы толькі слова, і ачуняе слуга мой. Ён не гаварыў: трэба абавязкова зрабіць тое і тое, выканаць нейкія пэўныя дзеянні. Ён меў такую непахісную веру, што не патрабаваў ніякіх доказаў таго, што Ісус – Сын Божы. Скажы толькі слова – і ачуняе. І Гасподзь здзівіўся і сказаў: ва ўсім Ізраілі Я не знайшоў такой веры. Такім чынам, мы бачым у сотніку самыя галоўныя хрысціянскія дабрадзейнасці: веру, прычым вельмі моцную; міласэрнасць і любоў да чалавека, не толькі чужога, але і падначаленага яму; і вялікае змірэнне. Таму і ачуняў яго слуга. Ён быў праведным, гэты сотнік, і Гасподзь адразу пачуў яго.

І калі Гасподзь адразу не выконвае нашы малітвы, гэта не таму, што Ён нас не чуе. Гасподзь чуе ўсё, Ён ведае нават нашы думкі. А чаму ж Ён марудзіць? Таму што мы далёка не праведныя. Гасподзь любіць праведнікаў, а грэшнікаў мілуе. Таму, калі мы хочам заслужыць у Бога міласць, калі хочам схіліць Яго волю да нашай просьбы, мы павінны сваю волю аб'яднаць з воляй Божай. Мы часта хочам атрымаць ад Бога тое, другое, трэцяе… – і не атрымліваем не толькі таму, што ў нашай малітве няма пакорнасці волі Божай і веры, але ў нашай малітве часта няма і любві. У асноўным у ёй бывае себялюбства, таму што мы звычайна просім за сябе. І нават калі молімся за кагосьці, то гэта часцей не з-за спачування да гэтага чалавека, а таму, што яго цяжкая доля абцяжарвае наша ўласнае жыццё, нам цяжка цярпець. Таму мы просім за яго, каб атрымаць сабе палёгку. І Гасподзь бачыць гэта і не спыняе выпрабавання. Ён чакае, калі ўмацуецца наша вера, калі ўзрасце наша міласэрнасць, калі наша змірэнне дасць дарогу благадаці Божай. І калі мы хочам, каб Гасподзь убачыў нас, і пахваліў нас, і рады быў нашым справам, думкам і словам, нам трэба ўзмацняцца ў гэтых трох дабрадзейнасцях.

Па-першае, у змірэнні. А змірэнне – гэта значыць заўсёды мець мірны, спакойны дух, лічыць сябе горшым за ўсіх, нявартым таго, што табе даецца. Па-другое, у веры. Трэба безумоўна і цвёрда верыць кожнаму слову, якое сказаў Гасподзь, – не ў якіясьці магічныя дзеянні ці замовы, а ў тое, што раз Гасподзь сказаў, то, значыць, гэта ёсць ісціна.

Гэта значыць, трэба сваю душу так звярнуць да Евангелля, каб кожнае слова сапраўды ўспрымалася намі як ісціна. Так, на словах мы быццам бы верым у Евангелле, а на справах – не. Мы жывем так, што калі б нам паказалі усё наша жыццё, мы б жахнуліся і памерлі ад разрыву сэрца. Мы проста прывыклі да граху, жывем у ім і нам здаецца, што мы добрыя і праведныя. Мы асляплены ўласным себялюбствам, але калі бачым гэты ж грэх у іншым, то абураемся: як жа так? ды як ён толькі так можа? Хоць самі робім не толькі так, а і ў тысячу разоў горш.

Ну і, канешне, няма ў нас міласэрнасці. Гасподзь даў галоўную запаведзь, без якой нельга ўвайсці ў Царства Нябеснае. Ўласна кажучы, яна і адкрывае туды ўваход: узлюбі таго, хто побач з табою. І не проста ўзлюбі, а як самога сябе: не жадай нікому таго, чаго ты не хочаш, каб зрабілі табе. Як проста! Калі не хочаш, каб цябе забілі, – і ты нікога не забівай. Калі не хочаш, каб цябе пакрыўдзілі, – і ты нікога не крыўдзі. А ў нас атрымліваецца, што мы заўсёды аддаем перавагу сабе перад іншым. Нам неабходна навучыцца разумець становішча іншых, успрымаць людзей, якія навокал нас, не як біялагічныя аб'екты, што дапамагаюць або перашкаджаюць нам жыць у дадзены момант, а падумаць,што ў іх таксама ёсць пачуцці, клопаты, пэўныя засмучэнні. Трэба навучыцца ўспрымаць іншага чалавека як самога сябе. Вось гэты сотнік: у яго хворы слуга. Ды хай ён памрэ, якая розніца? Іншага вазьму: падумаеш, слуга! Навошта ён патрэбны?

Ды не. Ён яго боль успрыняў як свой. Хварэе адзін, а спачувае яму другі. Але ў нас так не атрымліваецца. Гасподзь гаварыў: «Няхай усе будуць адно» (Іаан.17:21), і маліўся аб гэтым адзінстве. А яно можа здзейсніцца толькі праз любоў. Без яе нельга дасягнуць Царства Божага, таму што ўвайсці ў яго можна толькі тады, калі любіш Бога. А калі чалавек любіць Бога – гэта значыць, ён любіць наогул усіх. Таму Гасподзь і сказаў, што другая запаведзь падобна да першай. Калі чалавек навучыцца любіць Бога, ён не выбірае, ён любіць усё: і дрэва, і насякомае, і тым больш чалавека як найвышэйшае і найдасканалейшае стварэнне Божае.

Чаму чалавек не любіць Бога або чаму ён не любіць іншага чалавека, які знаходзіцца побач з ім? Ды таму, што ён ні пра Бога не мае ніякага ўяўлення, ні таго, хто знаходзіцца побач з ім, не адчувае.

Як жа ты, чалавек, не ходзіш у храм? Гэта гаворыць пра тое, што чалавек зусім не разумее, што тут адбываецца; у яго цалкам халоднае сэрца; ён абсалютна не адчувае прысутнасць Бога ў богаслужэнні. А калі ён не адчувае Бога, як ён можа любіць Яго?

А калі ён не любіць Бога, як ён можа любіць чалавека, які знаходзіцца побач з ім? А калі няма любві – тады магчымы ўсякі грэх, усякае вар'яцтва, любыя страшныя ўчынкі, якія нават цяжка ўявіць.

Чаму так адбываецца? Таму, што чалавек жыве грахом, а не любоўю да Бога. Таму, натуральна, калі з ім нешта здараецца і ён пачынае маліцца, імкнецца неяк ухіліцца ад цяжкіх абставін – нічога не атрымліваецца. Ён кажа: "Госпадзі, дапамажы!" – Маўчанне. Ён нічога не атрымлівае таму, што Гасподзь ведае: калі яму зараз дапамагчы, вызваліць яго ад таго, ад чаго ён пакутуе, даць тое, аб чым ён просіць, – гэты чалавек зноў вернецца да свайго звычайнага ранейшага грахоўнага ладу жыцця і да сваіх былых справаў. Няхай ён лепш знаходзіцца ў гэтых цяжкіх жыццёвых абставінах і пастаянна моліцца да Бога, стукаючыся то ў адныя дзверы, то ў другія, і, магчыма, у гэтым пошуку паступова штосьці зразумее, у яго сэрца трапіць хаця б адзін праменьчык благадаці Божай.

Тое, што цяжка атрымліваецца, каштуе больш за ўсё. Маці любіць больш тое дзіця, з якім яна больш намучылася. Гэта натуральна. І мастак любіць менавіта тую карціну, якая яму не давалася і над стварэннем якой ён працаваў значны час. У што чалавек укладае больш працы, тое яму даражэй. Менавіта таму Гасподзь зрабіў так, што шлях да Царства Нябеснага такі цяжкі – каб мы цанілі тую благадаць, якую Гасподзь дае нам, бо гэта самая вялікая каштоўнасць.

І вобраз гэтага евангельскага сотніка сапраўды павінен захавацца ў нашым розуме і сэрцы. Нам неабходна зразумець: калі мы хочам адразу штосьці атрымаць ад Бога, то павінны мець, папершае, моцную веру ў тое, што Гасподзь нас чуе. А калі Ён нам чагосьці і не дае ў дадзены момант, то, значыць, так нам трэба. Мы павінны мець вялікую пакору перад воляй Божай. Мы павінны быць гатовы прыняць тое, што Гасподзь дасць, нягледзячы на нашы просьбы, і нічога не патрабаваць ад Яго, як гэта звычайна бывае з намі.

І трэба абавязкова імкнуцца да міласэрнасці, стараюца змякчаць сваё сэрца. І калі ў нас сапраўды гэта будзе атрымлівацца, тады малітва наша будзе пачута, Бог будзе нас чуць, таму што праз любоў да ўсіх мы будзем з Ім у непарыўным дачыненні. Царква ставіць перад вачыма нашай душы нейкае люстэрка, каб мы, уважліва ўглядаючыся ў гэта люстэрка Евангелля, запыталіся ў сябе: ці так мы верым, як гэты рымскі сотнік, ці вера наша не большая за веру фарысеяў?

Што для нас на самой справе больш важнае: Смерць і Уваскрасенне нашага Збавіцеля або каменьчык з магілы святога, паясок з надрукаванай на ім малітвай ці вада са "святой крыніцы"?

Рымскі сотнік давярае Богу настолькі, што становіцца сведкам цуда. А мы з вамі падобныя да тых, пра каго апостал Павел сказаў: "Іудзеі патрабуюць цудаў" (1Кар.1:22). Нам, як і іудзеям, патрэбны цуды! А калі іх няма, мы гатовы самі іх прыдумаць: на карысць жа справы працуем! І ўжо не цуд, што я прыйшоў ад нявер'я да веры, і ўжо не цуд, што ў раней бязбожным горадзе на пустым месцы ўзнік храм, і ўжо не цуд, што Царква, ганімая і знішчаемая, распятая і амаль забуленая, адраджаецца, быццам фенікс з попелу.

Рымскі сотнік, чужаземец і язычнік, просіць у Госпада: " скажы толькі слова, і выздаравее слуга мой" (Мф.8:8). А для нас, небаракаў, усе словы даўно сказаны, Евангелле запісана і раздрукавана мільярднымі тыражамі, а нам – усё мала. Нам падавай агонь з нябёсаў! Вось чаму так лёгка шмат хто з нас паверыў, што прычына пагібелі чалавека не ў яго свядома здзейсненых грахах, а ў тым, які нумар ён атрымае ў дакументах падатковай інспекцыі. Ледзь да расколу царкоўнага справа не дайшла! А ўсё таму, што замест простага сэрца ў нашай пашкоджанай грэхападзеннем прыродзе пануе лжэімянны разум, а ўсё таму, што мы не Богу давяраем, а "паданням старцаў"! Так што не толькі да фарысеяў, але і да нас, тых, хто жыве ў дванаццаць першым стагоддзі пасля Нараджэння Хрыстова, звернуты гэтыя словы Збавіцеля: "Сыны царства будуць выкінуты ў цемру знешнюю; там будзе плач і скрыгат зубоў" (Мф.8:12). І трэба зразумець нам: калі мы верым у збавіцельную сілу пяску ці каменя, то з пяском або камнем і застанемся, бо сказаў Гасподзь: "ідзі, і, як ты вераваў, няхай будзе табе": калі верыў у камні – з імі і застанешся, верыў у Айца Нябеснага – Ён не пакіне цябе.

Верце ў Госпада, Які заўсёды знаходзіцца побач з намі і будзе знаходзіцца ва ўсе дні да сканчэння веку, жывіце праведна, шчыра кайцеся ў сваіх саграшэннях, выпраўляйце жыццё ваша ў адпаведнасці з запаведзямі Божымі, прасіце ў Госпада з непахіснай верай добрага і карыснага – і атрымаеце.

Сад мира «Сирень Победы» у стен древней Коложской церкви
пополнился новыми «пасхалиями»

7 мая 2018 года Аллею мира из сирени сортов Победы, заложенную по инициативе Борисо-Глебского (Коложского) храма города Гродно в 2016-м году, пополнили новыми саженцами.

В своем слове к участникам праздника настоятель храма протоиерей Александр Болонников отметил, что сирень на греческом называется пасхалия (πασχαλιά) и окончание Великой Отечественной Войны промыслительно совпало с Пасхой 1945-го года. Часто именно цветами сирени встречали воинов-освободителей, вернувшихся домой.

После торжественного открытия и поздравлений ветераны, школьники, руководство областного центра, представители предприятий, организаций и общественных объединений совместно высадили кусты сирени. Новые саженцы из Центрального ботанического сада Академии наук Беларуси привез академик Владимир Решетников.

Международный проект «Сирень Победы» был начат в 2011 году Советом ботанических садов России и Беларуси в продолжение традиции - посадки кустов сирени в память о Победе в Великой Отечественной войне.

Каждый сорт имеет свое неслучайное название, которое можно прочесть на специальной этикетке. Есть сорт имени героя-партизана Константина Заслонова, сорт, посвященный защитникам Брестской крепости. Есть и сорт «Маленький принц», названный в честь героя сказки французского писателя, военного летчика Антуана де Сент-Экзюпери.



Цели проекта - сохранение памяти о героях Великой Отечественной войны, обеспечение преемственности поколений, воспитание молодежи на примерах и героических традициях народа.

Продолжить формирование сада планируется до 100-летнего юбилея Победы.

Акция завершилась в храме в честь Коложской иконы Божьей Матери совместной молитвой об упокоении погибших в Великой Отечественной войне.

Николай БАЙДА

В храме деревни Колонтаи состоялось соборное богослужение священнослужителей Волковысского благочиния

8 мая 2018 года, в день памяти святого апостола и евангелиста Марка, в Крестовоздвиженском храме д. Колонтаи Волковысского района состоялось соборное богослужение священнослужителей Волковысского благочиния. Божественную литургию возглавил благочинный округа иерей Александр Юзва.

С проповедью к прихожанам обратился протоиерей Вадим Шелест, который кратко рассказал о благовестнических трудах и страданиях святого апостола и евангелиста Марка и отметил необходимость постоянно укреплять свою веру в Господа через усердное изучение и исполнение Его животворных заповедей, раскрытых нам в Евангелии Господа нашего Иисуса Христа.

После совершения Божественной литургии был отслужен краткий молебен святому апостолу и евангелисту Марку, по окончании которого благочинный поздравил всех присутствующих с продолжающимся праздником Пасхи, поблагодарил настоятеля храма протоиерея Александра Вечорко и всех прихожан за труды и молитвы на благо прихода и пожелал всем помощи Божией и радости о Господе Воскресшем.

Иерей Георгий СУВОРОВ



Память великомученика Георгия Победоносца в поселке Порозово

Уже стало доброй традицией проводить богослужение в церкви Святой Живоначальной Троицы г. п. Порозово в память великомученика Георгия Победоносца. Это был воин, который стоял за правду, за христианскую веру, и за это пострадал.

В воскресенье 6 мая 2018 года была совершена панихида обо всех воинах, погибших в годы Великой Отечественной войны. Также настоятель храма протоиерей Фёдор Шелест с прихожанами Крестным ходом посетили памятник воинам-освободителям, павшим в 1943 году при освобождении Порозово от немецких захватчиков, где совершили заупокойную литию.

Наш долг – чтить память отцов и дедов, которые отдали свою жизнь ради счастливого будущего своих детей, внуков, правнуков.

Е.САВИЦКАЯ



150-летие храма святителя Николая Чудотворца поселка Большая Берестовица

17 мая 2018 года для прихожан храма святителя Николая Чудотворца городского поселка Большая Берестовица стал двойным праздником. Вознесению Господа и Спаса нашего Иисуса Христа в этот день сопутствовал 150-летний юбилей храма.

Поздравить прихожан с праздником и совершить Божественную литургию в храм прибыл архиепископ Гродненский и Волковысский Артемий. Его Высокопреосвященству сослужили: секретарь епархии митрофорный протоиерей Анатолий Ненартович, благочинный Берестовицкого округа протоиерей Сергий Шелест и настоятель прихода протоиерей Виталий Яромич.

За Литургией Владыка Артемий вручил церковные награды духовенству и прихожанам.

Так, медали «Коложский Крест» II степени были удостоены:

- протоиерей Виталий Яромич, настоятель храма;
- Филон Владимир Викентьевич, прихожанин храма.

Медалью «Коложский Крест» III степени были награждены:

- Яромич Вера Витальевна, регент храма;
- Болбот Сергей Евгеньевич, прихожанин храма;
- Никон Владимир Георгиевич, прихожанин храма.

Архиерейская грамота была вручена следующим лицам:

- Борель Григорий Иванович, прихожанин храма;
- Циневский Александр Владимирович, прихожанин храма;
- Борель Софья Ивановна, прихожанка храма;
- Дорошкевич Галина Андреевна, прихожанка храма;
- Отоко Елена Митрофановна, прихожанка храма;
- Сатыго Галина Александровна, прихожанка храма.

Александр ШУРСКИЙ

История храма

Время постройки первого православного храма в местечке Великая Берестовица неизвестно, хотя есть предположения, что какой-то храм несомненно был.

Согласно архивным материалам, церковь, существующая на данный момент, была построена в период с 1860 по 1868 г. Бывшая деревянная ветхая церковь разобрана, и из оставшегося материала построена на кладбище часовня. На месте, где существовала деревянная церковь, в 1860 году началась постройка новой церкви из булыжного камня. В том же году были заложены фундаменты и выведены стены вышиною до окон.

Характерно для построек того времени то, что стенам придавалось особое значение - стены имели толщину 120 см и более, что особо важно для осенне-зимнего периода года, когда уже наступают первые холода. Стены «умеют» хранить высокую тепловую энергию солнца и способны регулировать температуру воздуха в здании церкви в течение определённого периода, кроме того практически не разрушаются.



В 60-х годах 20-го века храм постигла участь большинства культовых зданий. Он был закрыт и долгое время в храме размещались склады, мастерские, проводились сварочные работы, покраска и другие виды работ, которые не могли не отразиться на состоянии храма.

Последним настоятелем храма перед закрытием был митрофорный протоиерей Геннадий Гахович.

В 1989 году храм вернули православной общине. Начались восстановительные работы. Освятили храм 25 февраля 1990 года. 9 апреля 1990 года Высокопреосвященнейшим Филаретом, Митрополитом Минским и Гродненским, Патриаршим Экзархом всея Беларуси настоятелем храма был назначен иерей Виталий Яромич.

Все последующие годы силами настоятеля и прихожан храм приводился в порядок.

К храму подведены вода и природный газ, сделано автономное газовое отопление.

В 1990 году был построен двухэтажный, двухквартирный церковный дом для проживания священника и регента.

В 1998 году сделан и установлен новый резной иконостас, а в 1999 году изготовлены пять напольных киотов.

Восстановлена каменная ограда вокруг храма.

В 2008 году было выполнено детальное исследование несущих конструкций кровли храма, показавшее, что значительная часть деревянных конструкций нуждается в замене. По благословению Преосвященнейшего Артемия, епископа Гродненского и Волковысского, был начат ремонт кровли храма.

В 2008 году было получено разрешение Департамента по охране историко-культурного наследия и изготовлена проектная документация на реконструкцию кровли храма. Выполнены работы по реконструкции колокольни. 16 декабря 2008 года на колокольню был поднят новый купол и водружён освященный крест.

3 апреля 2009 года во время соборного богослужения духовенства Берестовицкого благочиния после Литургии Преждесвященных Даров Его Преосвященство Владыка Артемий освятил новый крест на купол храма.

Были заменены и укреплены несущие конструкции кровли и 2 октября 2009 года на храм был поднят новый купол и крест. Верхняя часть храма была перекрыта окрашенной жестью.

Церковь внесена в Государственный перечень историко-культурного наследия Республики Беларусь под шифром 413Г000077 в соответствии с постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 14.05.2007 года №578 Национальный реестр правовых актов Республики Беларусь 2007 года №119,5/25167



У вёсцы Галубы Шчучынскага благачыння асвяцілі новую царкву

12 траўня бягучага года ў вёсцы Галубы Мастоўскага раёна адбылося ўрачыстае богаслужэнне, падчас якога быў асвечаны храм у гонар вобраза Прасвятой Багародзіцы “Хуткапаслушніца”.

Узначаліў малітву ў гэты дзень Высокапраасвяшчэннейшы Арцемій, Архіепіскап Гродзенскі і Ваўкавыскі, у саслужэнні сакратара Гродзенскай епархіі мітрафорнага протаіерэя Анатолія Ненартовіча, благачыннага Шчучынскай акругі іерэя Аляксандра Пасцярняка, настаяцеля храма іерэя Ігара Марчыка і некаторых святароў благачыння.

Невыпадковым стаў і выбар назвы новай святыні. Вобраз Божай Маці “Хуткапаслушніца” са старажытных часоў вельмі ўшаноўваецца сярод праваслаўных вернікаў. У летапісу манастыра Дахіар святой гары Афон першае ўзгадванне аб гэтай іконе датуецца 1664 годам. Дакладна вядома і тое, што летам 1996 года была знойдзена ў манастыры і сама фрэска вобраза Багародзіцы, 1563 года напісання. У 1865 годзе быў асвечаны Свята-Міхайлаўскі храм у Шчучыне, у якім з першых дзён існавання знайшла свой прытулак копія вядомай дахіарскай святыні. Больш ста пяцідзесяці гадоў вернікі шчучыншчыны ўзносяць свае малітвы да Бога перад гэтым цудатворным вобразам, таму і выбар назвы для новага храма стаў вельмі сімвалічнай данінай пашаны і памяці.

Пасля заканчэння чына асвячэння храма, непасрэдна перад пачаткам Літургіі, са словам да ўсіх прысутных звярнуўся Высокапраасвяшчэннейшы Арцемій. У прыватнасці, Уладыка адзначыў вялікую ролю храма для духоўнага жыцця чалавека, для збавення душы.

"Вам не перадаць словамі ўсіх пачуццяў, якія ўздымаюць незвычайную радасць у маёй душы! - гаворыць Аляксандар Пятровіч Васько, адзін з шасці дзяцей у сям’і мясцовых жыхароў. - Шмат гадоў майго жыцця было аддана службе на дзяржаўнай пасадзе. Але бацькі ніколі не выхоўвалі нас атэістамі, у хаце заўсёды былі абразы і жыла малітва. Я вельмі яскрава памятую сваё дзяцінства, праведзеннае вось на гэтых старажытных нёманскіх берагах Ліпічанскай пушчы. Бацькі мае, як і ўсе мясцовыя жыхары, мелі вялікую праблему з тым, каб дабрацца да храма нават у вялікія святы царкоўнага года - Нараджэнне Хрыстова і Пасху. Самымі блізкімі былі храмы ў в. Рымкі (Турэйск) і Шчара (знішчаны ў пачатку Вялікай Айчыннай вайны). Некаторыя дабіраліся ў в. Орля. Летам пытанняў не было. Праблема была тады, калі зімой, на само свята Хрыстова Раства, надзвычайна вялікія снежныя пакровы адразалі ўсе дарогі, а тэхнікі, як цяпер, не было ў тыя гады. На Вялікдзень павадак вясновы ператвараў вёску ў востраў, зноў адрэзаны ад “вялікай зямлі”. Уяўляеце, якім быў шлях да храма ў гэтыя перыяды? Гады прайшлі. І вось цяпер нашы вочы бачаць храм, які стаў сапраўднай узнагародай за ўсе гады выпрабаванняў для маіх землякоў!"



З гэтымі разважаннямі нельга не пагадзіцца. І малітвы Архіпастыра, і прашэнні святароў з народам, і мілагучныя мелодыі ансамбля пеўчых шчучынскіх храмаў - усё гэта ўпершыню насыціла гукамі сапраўднага богаслужбовага жыцця не толькі сцены былой бібліятэкі, але і прыроду навокал. Стаўшы прыпісным да Свята-Пакроўскай царквы в. Орля храм ў Галубах напоўніў новым сэнсам жыццё ўсяго наваколля. Некалькі разоў выдалася пачуць ад галубчан думку аб тым, што новая царква для іх цяпер з’яўляецца не толькі месцам для малітвы, але і сродкам адказнасці перад Богам і нашчадкамі за сваё духоўнае жыццё.

Пасля Еўхарыстычнай трапезы дзесяткі вернікаў змаглі падмацаваць свае сілы і звычайнай ежай, рупліва падрыхтаванай для ўсіх жадаючых на сталах ля сцен храма. А калажы фотаздымкаў, размешчаных на дрэвах побач з царквой, проста і непрадузята перадалі атмасферу супольнай працы вяскоўцаў дзеля таго, каб стварыць сваімі рукамі храм Божы. Звярнуўшы ўважлівы позірк на здымкі, без асаблівай цяжкаскі кожны сумленны чалавек зразумее, што не дарэмнымі былі ўзнагароды, прынятыя прыхаджанамі з рук Архіпастыра за добрасумленную працу.

Па-летняму цёплае веснавое надвор’е, безумоўна, дадала ласкі і пяшчоты ў настрой людзей, сабраўшыхся дзеля малітвы. Здавалася, што ўся прырода падзяляла радасць свята. І адслужанае напярэдадні Ўсяночнае трыванне, і сама Літургія назаўсёды пакінулі ў паветры старажытнага Ліпічанскага леса словы яшчэ больш старажытнай малітвы, загучаўшай па-новаму ў гэтых мясцінах: “Слава ў Вышынях Богу! І на зямлі мір! У людзях благаваленне!”

Святар Сергій СЯМАШКА

Завершил работу Международный Георгиевский слет православных скаутов


13 мая 2018 года закончил работу Международный Георгиевский слет православных скаутов.

Слет проходил 11-13 мая по благословению Высокопреосвященнейшего Артемия, архиепископа Гродненского и Волковысского на территории Гродненской епархии в зоне отдыха «Августовский канал».

Гродненскую епархию на слете представляли скаутские отряды приходов храма в честь Собора Всех Белорусских Святых, святителя Спиридона Тримифунтского (микрорайон «Ольшанка») и преподобномученика Афанасия Брестского (микрорайон «Зарица).

В рамках слета проводились тренировки по скаутскому мастерству, богослужения, духовные беседы со священниками, экскурсии по Августовскому каналу и др. Среди участников дети и подростки (от 10 лет) из Гродно, Минска, Могилева, Литвы и Польши.

Иерей Илья ГАПАНОВИЧ



«Пока не будет чисто в душе, не будет чисто на планете»

Как сотрудничают экологи и священники? Об этом рассказали Сергей Юшкевич из Центра экологических решений и Александр Пастерняк, благочинный Щучинского округа на экофоруме «Экология души – экология жизни» в Щучине.

– Гродненская епархия – одна из первых епархий БПЦ, в которой был организован экологический отдел. Это свидетельствует о небезразличии духовенства и Церкви к состоянию окружающего мира. Казалось бы: Церковь, экология – где связь? Но возрождение экологии невозможно без нравственного и духовного возрождения человека, – говорит Александр Пастерняк.

Сергей Юшкевич – руководитель направления «Церковь и охрана окружающей среды» Центра экологических решений. Оно возникло в 2014 году в рамках программы по экологически дружественному образу жизни. ЦЭР сотрудничает с православной, католической и протестантской церковью.

Программа «Церковь и охрана окружающей среды» помогает развивать экологическую деятельность Православной церкви в Беларуси. Информацию о деятельности можно найти на сайте, на единственном в Беларуси ресурсе о сотрудничестве экологов и Церкви.

В Беларуси в области церковной экологической деятельности существует несколько инициатив.

Экологический отдел есть в епархиях БПЦ, в том числе – в Гродненской и Брестской. Элементы экологического воспитания присутствуют в работе Отдела по делам молодёжи БПЦ. Существует христианское социальное служение – общественное объединение, которое занимается водными источниками. А в Минске есть Христианский образовательный центр имени святых Мефодия и Кирилла. В 2016 году было подписано соглашение между Министерством природных ресурсов и Белорусской православной церковью по работе на 2016-2020 год.

– Мы проводили исследования и спрашивали православную молодёжь: вы интересуетесь вопросами экологии? И часто встречали искренний ответ, что Церковь не имеет отношения к экологии. Никто не знал про официальные церковные документы по экологии, – говорит Сергей. – Надо начинать с образования и воспитания детей и взрослых. Просто говорить об экопроблемах современности всем надоело. Нужно сказать: а что делать, что от меня зависит?

Приходы совместно с ЦЭР организовывают беседы, велопоходы, уборки мусора и другие мероприятия. Молитвы в церковные праздники можно совмещать с добрыми делами, направленными на экововоспитание.

Например, в первое воскресенье сентября отмечается праздник, посвящённый бережному отношению к божьему миру. В этот день, помимо молитвы, можно поучиться или устроить уборку.

Ту же акцию "Зробім!" можно совместить с экскурсией и молитвой.

ЦЭР создал передвижную выставку «Человек и творение», которая ездит по белорусским храмам и рассказывает, что христианин может сделать для улучшения экологии. На территории одного из минских православных приходов ЦЭР создал экотропу. Школьники посещают её в рамках внеклассных занятий. Сейчас практически на каждый день посещения расписаны.





Большую поддержку у населения и церковного руководства получила тема искусственных цветов на кладбище. ЦЭР предлагали экологические решения этой проблемы и вели информационную работу через плакаты на кладбище. Митрополит разрешил вешать плакаты и благословил их.

В рамках образовательных семинаров для священников была организована экскурсия на минский полигон твердых бытовых отходов «Тростенецкий». Сергей говорит, что это сработало. Глядя на пластик и полиэтиленовые пакеты, некоторые решили изменить свою жизнь.

– Экология природы не имеет будущего без экологии души – личного и духовного развития каждого человека. Если поступки и помыслы будут чистыми, будет чиста и планета. Поэтому форум так называется, – говорит Елена Пасюта, директор гимназии №1 Щучина, в которой был организован форум.

Форум делился на две части. В первой гости-специалисты рассказывали о своей деятельности, а во второй учащиеся делились своими исследованиями. В конце форума участники заложили аллею роз и вишневый сад.

Возможно, после форума в гимназии создадут отряд школьного лесничества, который будет помогать в работе Щучинскому лесхозу с экотропой и мониторингом вредителей леса.

Елена **КОВАЛЬЧУК,**
ГРОДЗЕНСКІ ЗЯЛЁНЫ ПАРТАЛ


Жировичи: памятники и памятные места, связанные с именем митрополита Иосифа (Семашко)

С каждым годом время все дальше и дальше удаляет нас от тех эпохальных событий второй четверти XIX в., когда по инициативе архиерея-воссоединителя епископа Иосифа (Семашко) полтора миллиона белорусских и украинских униатов, разорвав вековые оковы латинства, возвратилось в лоно Единой Святой Соборной Апостольской Православной Церкви. И естественно, с течением времени забываются те памятные места и утрачиваются памятники, которые связаны с именем митрополита Иосифа. Немалую роль в деле забвения нашей исторической памяти сыграли гонения на Православную Церковь на территории Западной Беларуси в период вхождения ее в состав второй Речи Посполитой (1921–1939 гг.), а затем Советского государства (1939–1941, 1944–1991 гг.).

Тем не менее, несмотря на все сложности и перипетии, в Жировичах сохранился ряд памятников и памятных мест, связанных с именем митрополита Иосифа (Семашко). Постараемся рассмотреть их в хронологическом порядке в связи с жизнью и деятельностью владыки Иосифа.

По инициативе члена униатского департамента Петербургской римско-католической коллегии Иосифа Семашко в конце 20-х гг. XIX в. в униатской церкви начались преобразования, направленные на сближение, а в последующем на объединение униатов с Православной Церковью. Указом императора Николая I от 22 апреля 1828 г. из четырех униатских епархий были оставлены две: Белорусская с центром в Полоцке и Литовская с центром в Жировичском монастыре. При каждой епархии была учреждена консистория, семинария и низшее духовное училище .

О значении Жировичского монастыря в деле воссоединения униатов так отзывался митрополит Иосиф: «Премудрый Зиждитель, избравший смиренный вертеп Вифлеемский для рождения от Пречистой Девы Единородного Своего Сына, избрал для обновления Церкви Литовской не блестящий град, а смиренный уголок, находящийся под особенным покровом Пречистой Девы, прославленной в чудотворной иконе Жировицкой. Здесь православные христиане благостию Божией, предстательством Небесной Владычицы, преобразились мы верою, возвратясь к чистым догматам древней Православной Церкви; преобразились духом, возвратясь к постановлениям и сообществу с родной нашей матерью – Всероссийской Церковью; преобразились сердцем, обновя чувства родственной любви к великому нашему русскому племени и русскому Отечеству. Здесь старцы с радостным умилением видели возвращение к прежнему церковному порядку, которому они следовали по большей части в начатках своей жизни. Здесь зрелые мужи взвешивали прошедшее с настоящим, хитросплетения лжи со светлыми указаниями здравого смысла; и преклонили умы и сердца свои перед непреложной истиной. Здесь юноши, приобретая отличное умственное образование в истинном духе Христианской Православной Церкви, учились любить вместе с сей духовной своей матерью и земное свое отечество – Русь Православную». Поэтому неудивительно, что польский католический историк, писатель и публицист Валерьян Харкевич (1890–1950) назвал Жировичи «гробом унии» .



Жировичский монастырь. Литография с гравюры А. Кюлевайна 1-ой пол. XIX в.

